Д. В. ГЕРАСІМЁНАК

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ

У сучасным грамадстве ва ўмовах глабалізацыі і развіцця сродкаў масавай інфармацыі ўсё большае значэнне, як надзейны гарант захавання ідэнтычнасці і самабытнасці народа, набывае нацыянальная культура. Яна спрыяе духоўна-маральнаму развіццю насельніцтва, трансліруе базавыя каштоўнасці чалавека, фарміруе любоў да роднай краіны. Працэс інфарматызацыі грамадства, сучасныя сродкі перадачы і, адпаведна, спажывання інфармацыі, з'яўленне 3D-мадэлявання, электронных экспазіцый і выстаў, дазволілі па-новаму паглядзець на праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны краіны, прывялі да пастаноўцы тэарэтычных і практычных пытанняў у дачыненні да сродкаў рэалізацыі інфармацыйнага патэнцыялу нацыянальнай культуры.

У гэтым артыкуле мы разглядаем магчымасці захавання гісторыка-культурнага патэнцыялу нашай краіны на прыкладзе сядзібна-паркавай спадчыны роду Тышкевічаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, змяшчаючы толькі кароткую інфармацыю аб дадзеных помніках для таго, каб акрэсліць падыходы да іх музеефікацыі. Для мясцовай культуры менавіта сядзіба была тым месцам, вакол якога фарміруецца культурнае асяроддзе горада ці мястэчка, а значыць і нацыянальнай культуры ў цэлым. З пазіцыі культурна-семіятычнага падыходу, сядзіба – гэта «месца лакалізацыі, перасячэння гісторыі дзяржавы і гісторыі паўсядзённасці» [3, с. 57]. Менавіта ў сядзібным доме ва ўлонні сям'і адбывалася інтэлектуальнае і маральнае станаўленне асобы.

Даследчыкі канстатуюць той дастаткова відавочны факт, што многія беларускія сядзібныя палацы былі знішчаны, аб факце іх існавання нагадваюць толькі руіны, рэшткі паркаў, малюнкі Н. Орды. Тое, што захавалася, патрабуе не толькі фізічнага аднаўлення, але, перш за ўсё, дасканалага вывучэння, навуковай трансляцыі былой культурнай і гістарычнай каштоўнасці помнікаў, таму што кожны палацавы комплекс спрыяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму жыццю навакольнага рэгіёна [3, с. 58].

У літаратуры інфармацыя аб сядзібна-паркавай спадчыне Тышкевічаў прадстаўлена як айчыннымі напрацоўкамі – матэрыяламі канферэнцый «Тышкевіцкія чытанні», работамі Л. М. Несцярчука, А. П. Федарука, В. Г. Анціпава, артыкуламі ў энцыклапедыях «Архітэктура Беларусі», «Збор помнікаў гісторыі і культуры» і інш., так і замежнымі – Р. Іфтаназі, А. Урбанскі і інш. Дзейнасць роду адлюстравана і ў інтэрнет-прасторы (парталы Віртуальны музей горада Лагойска, Глобус Беларусі і інш.), а таксама ў публіцыстычных перыядычных выданнях.

Важнасць раскрыцця інфармацыйнага патэнцыялу гісторыка-культурнай спадчыны Тышкевічаў заключаецца ў значнасці дадзенага роду ў сацыякультурным жыцці нашай краіны. Род Тышкевічаў быў даволі ўплывовы і разгалінаваны, яго прадстаўнікі займалі высокія дзяржаўныя і ваенныя пасады і пакінулі значны след у айчыннай навуцы і культуры. Валоданні іх у розныя стагоддзі знаходзіліся ў многіх месцах Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку ў Астрашыцкім Гарадку, Валожыне, Свіслачы, Лагойску і інш. У палацах захоўваліся прадметы мастацтва і гісторыі, рэдкасці, кнігі, што сведчыць аб фарміраванні на іх тэрыторыі своеасаблівых прадмузейных збораў.

У цяперашні час гісторыка-культурная спадчына роду Тышкевічаў прадстаўлена шматлікімі сядзібамі на тэрыторыі нашай краіны. Ландшафтнае асяроддзе сядзіб і іх архітэктурныя формы знаходзяцца ў розным стане захаванасці, выкарыстоўваюцца пад розныя патрэбы грамадства, галоўным чынам, не звязаныя з іх першапачатковым значэннем, у тым ліку і як месца адлюстравання лакальнай культуры народа.

Добрую захаванасць мае Валожынскі палац, пабудаваны Я. Тышкевічам ў стыле класіцызму на пач. XIX ст. Ансамбль уключаў у сябе палац, афіцыну, парк, аранжарэю, гаспадарчыя пабудовы [1, с. 104]. Комплекс дайшоў да нашага часу ў дастаткова добрым стане, мае выдатныя магчымасці для музеефікацыі, аднак выкарыстоўваецца не па першапачатковаму прызначэнню, а як месца для размяшчэння адміністрацыйных устаноў (ваенкамат, ДАІ і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сядзіба «Вялае» каля в. Рудня была ўзведзена ў кан. XIX ст. на беразе ракі Іслач недалёка ад Валожына. Кампазіцыйным цэнтрам сядзібы стаў двухпавярховы палац, пабудаваны ў эклектычным стылі, быў закладзены пейзажны парк [5, с. 162]. Зараз ад палаца захаваліся толькі руіны і рэшткі гаспадарчых пабудоў, а аб старым парку нагадваюць адзінкавыя дрэвы.

Яшчэ больш трагічны лёс напаткаў сядзібу Тышкевічаў у Свіслачы на Гродзеншчыне. Сядзіба другой паловы XVIII ст. уключала палац, аранжарэю, парк, гаспадарчыя пабудовы [4, с. 71]. Да сенняшняга часу да нас дайшоў толькі часткова захаваўшыйся парк, які з’яўляецца найбольш буйным тэрасным паркам на тэрыторыі Беларусі.

Палац Тышкевічаў у Лагойску, які пабудаваны ў пач. XIX ст. у формах класіцызму, захаваўся ў руінах. Менавіта з яго ўладальнікамі – графам П. Тышкевічам і яго сынамі К. і Я. Тышкевічамі, звязана цэлая эпоха станаўлення і развіцця археалогіі, этнаграфіі, музеязнаўства і фалькларыстыкі. Комплекс уяўляў развітую архітэктурную кампазіцыю, размешчаную на высокім месцы і арыентаваную на раку Гайна. Лагойскі палац паўплываў на культурнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё былога мястэчка, спрыяў пераўтварэнню яго ў горад. Сядзіба Тышкевічаў у размешчаным недалёка ад г. Лагойск Астрашыцкім Гарадку не захавалася, уяўленне аб ей даюць матэрыялы інвентароў і некаторыя літаратурныя крыніцы. У ансамбль уваходзілі палац, парк і звярынец [5, с. 176–184].

Сядзібна-паркавы ансамбль ў в. Вароўскага (Барысаўскі раён), пабудаваны Тышкевічамі ў другой пал. XIX ст., уключаў у сябе аднапавярховы сядзібны дом, парк, штучныя вадаёмы і гаспадарчыя пабудовы рознага прызначэння [5, с. 293]. На сённяшні дзень захаваліся фрагменты парку, бровар і некалькі дапаможных збудаванняў.

На пачатку 1930-х гг. нашчадкамі дваранскага роду была створана сядзіба ў в. Жаркаўшчына (Свіслацкі раён), якая ўяўляла сабою невялікі драўляны трохпавярховы палац з пейзажным паркам [2, с. 39]. Сядзіба дайшла да нашага часу фактычна без змен і выкарыстоўваецца мясцовымі ўладамі як дом адпачынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не дайшлі да нашага часу, або захаваліся фрагментарна як рэшткі парку ці гаспадарчых пабудоў сядзібы ў вёсках Пагародна, Дунілавічы, Першаі, г. п. Плешчаніцы і інш.

Безумоўна, гэта не поўны агляд усіх сядзіб роду Тышкевічаў у сучасных межах Рэспублікі Беларусь, але ён дазваляе больш-менш акрэсліць стан захаванасці архітэктурнай спадчыны нашых славутых землякоў.

На падставе акрэсленай вышэй інфармацыі можна прапанаваць наступную сістэматызацыю помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Тышкевічаў з улікам магчымасцей выкарыстання іх інфармацыйнага патэнцыялу. Сядзібна-паркавыя помнікі дваранскага роду, на нашу думку, можа паздяліць наступным чынам:

1. Сядзібы, прыдатныя для музеефікацыі, на аснове якіх можна стварыць музей, тым самым найбольш поўна актуалізаваць гісторыка-культурную спадчыну адной з галін графскага роду Тышкевічаў. Да іх можна аднесці сядзібна-паркавыя комплексы ў г. Валожын, в. Жаркаўшчына). Іх даволі рэальна ў кароткі тэрмін прывесці да музеефікаванага стану, што ствärала б шырокія магчымасці па раскрыцці іх інфармацыйнага патэнцыялу. Сядзібы ў г. Валожын і в. Жаркаўшчына зараз выкарыстоўваюцца як адміністрацыйныя ці рэкрэацыйныя ўстановы, што памяншае магчымасці музеефікацыі помніка ў далейшым, аднак дазваляе падтрымліваць помнікі ў належным стане.

2. Помнікі са значным інфармацыйным патэнцыялам. Магчымасці для іх актуалізацыі можна ажыццявіць уключэннем помнікаў у турыстычныя маршруты ці шляхам правядзення тэматычных мерапрыемстваў (г. Свіслач, в. Вароўскага, в. Рудня). Дадзеная група таксама можа быць уключана ў сферу музейных інтарэсаў такім жа чынам, як і першая, аднак патрабуе значных фінансавых капіталаўкладанняў.

3. Ансамблі помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва, якія не дайшлі да нашага часу (в. Пагародна, г. п. Плешчаніцы і інш.). Пры раскрыцці іх інфармацыйнага патэнцыялу існуюць пэўныя складанасці, абумоўленыя станам іх захаванасці, пры рэпрэзентацыі дадзеных помнікаў гісторыі і культуры. Гэтая група, па сутнасці, выключана з інфармацыйнай прасторы грамад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства, аднак памяць пра факт існавання дадзеных помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны роду Тышкевічаў можа падтрымлівацца музеефікаванымі ўстановамі першай і другой групы ці шляхам выкарыстання помнікаў трэцяй групы як аб'ектаў экскурсійнага паказу.

У цяперашні час музей і экскурсійная дзейнасць праз прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны краіны, і, адпаведна, роду Тышкевічаў, у прыватнасці, можа абудзіць актыўную цікавасць сучаснага грамадства і будучых пакаленняў у справе захавання памяці аб гісторыі і культуры нашага народа, раскрыць самабытнасць культурнай спадчыны краіны на сусветным узроўні. Гістарычнае мінулае ўсё больш аддаляецца ад цяперашняга часу велізарнай культурна-гістарычнай дыстанцыяй, таму музей праз спецыфічныя формы музеефікацыі і актуалізацыі спадчыны можа зрабіць даступным для ўспрымання адгалоскі спадчыны Тышкевічаў, скласці цэласную карціну дзейнасці дадзенага роду, аднавіць сувязь сучаснага грамадства з мінулым, тым самым абудзіць цікавасць да гісторыі і культуры нашай краіны.


*1.* Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: А. А. Воінаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

*2. Несцярчук, Л. М.* Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 334 с.

*3. Сакалова, В. М.* Палац як семіятычны кампанент магнацкай культуры / В. М. Сакалова // Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве : Пятыя міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г. : манагр. зб. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Kretingos muziejus grafų Tiškevičų dvare. – Мінск, 2014. – С. 57–72.

*4. Федорук, А. Т.* Садово-парковое искусство Белоруссии / А. Т. Федорук. – Мінск : Ураджай, 1989. – 247 с

*5. Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Мінск : Полифакт, 2000. – 416 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ